# БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ

Беларускае вяселле, як і шлюбная абраднасць іншых усходнеславянскіх народаў, мела некалькі этапаў: сватанне, запоіны, заручыны (змовіны), зборная субота, каравай, пасад, прыезд дружыны жаніха па нявесту, вясельнае застолле, дзяльба каравая, ад’езд да дому маладога, сустрэча маладых, ход вяселля ў хаце маладога.



rawpixel

Вясельнае застолле – гэта сімвал нараджэння новай сям’і, “вянец” усеагульнай радасці. У вясельных песнях славіліся маладыя, іх бацькі, сваты. Багаты вясельны стол – сімвал заможнасці будучай сям’і. Лічылася, што маладыя не павінны есці і піці на вяселлі (устрыманне ад яды і піцця на ўласным вяселлі забяспечвала маладым у будучым сямейным жыцці заможнасці. З гэтай нагоды малады пры сустрэчы з бацькамі маладой выліваў за сябе паднесеную яму першую і другую чаркі гарэлкі.



rawpixel

# СВАТАННЕ

- Сватанне – гэта своеасаблівая спрэчка-торг. Раней такі торг праходзіў сур’езна, у старажытнасці такім чынам вырашалася пытанне аб шлюбе маладых людзей.

- Мэта сватання – дамовіцца аб шлюбе. Сватоў падбіралі на Беларусі з ліку мужчын, жанатых, паважаных, хаця ўдзельнічалі і жанчыны.

rawpixel

# ЗАПОІНЫ

- (Запівіны, “малыя заручыны”…) – адзін з падрыхтоўчых этапаў вяселля, на якім нявеста і яе бацькі ў прысутнасці блізкай радні афіцыйна давалі згоду на шлюб. На запоінах замацоўвалася гэта згода. Пасля запоін дзяўчына лічылася засватанай.

- На запоіны ездзілі вечарам, ціха.

rawpixel

# ЗАПОІНЫ

- Пасля запоін не абавязковым яшчэ быў шлюб, ён мог і разладзіцца. У такім выпадку вінаватым даводзілася вяртаць выдаткі супрацьлегламу боку.

- Запоіны нагадваюць сабой “барыш” – звычай замочваць якое-небудзь гандлёвае пагадненне.

  Запоіны – перажытак звычаю куплі-продажу нявесты.

- У наш час традыцыйныя запоіны фактычна не захаваліся.

rawpixel

# Змовіны

- **Змовіны** (заручыны) – адзін з падрыхтоўчых этапаў вяселля, на якім у прысутнасці шырокага кола сваякоў канчаткова замацоўвалася згода на шлюб.
- Задача змовін – заручыцца згодай радні жаніха і радні нявесты на шлюб, больш пэўна замацаваць гэту згоду, дамовіцца аб падрабязнасцях вяселля.
- На заручыны ехалі днём, гучна.

rawpixel

# *Заручыны ўключаюць наступныя абрады:*

- **а)** жаніх і нявеста над хлебам або над міскай падавалі адзін аднаму рукі і іх звязвалі ручнікам;
- **б)** жаніх прывозіў пачастункі для сяброўак нявесты, якія і сімвалізавалі яе выкуп з дзявоцкай грамады;
- **в)** бацькі нявесты і жаніха абменьваюцца падарункамі і ўдзельнічалі ў сумесным пачастунку, што сімвалізавала замацаванне заключанага саюзу – дагавору;
- **г)** нявесце расплятаюць касу, якую яна не заплятала да самага пярэдадня вяселля;
- **д)** маці або хросная маці нявесты ў знак згоды на шлюб павязвалі ўсіх сватоў жаніха ручнікамі, кавалкам палатна.

rawpixel

# ЗБОРНАЯ СУБОТА

- **Асноўным рытуалам зборнай суботы з’яўляецца віццё вянка, гэта развітальны вечар маладой з сяброўкамі. Тэрмін, якім ён абазначаны, мае вялікую колькасць варыянтаў: суборная субота, дзявічнік, паненскі вечар, вяночкі, дзявоцкія заручыны, пірог, мёд, дзявічкі.**



rawpixel

# Пасад жаніха

- Гэты момант характэрны толькі для беларускай вясельнай абраднасці, адбываўся ўвечары напярэдадні шлюбу або ў дзень перад ад’ездам маладога да маладой, каб разам ехаць да вянца.

- Сабраўшы дружыну, малады прасіў благаславення ў яе на пасад і на выпраўленне да шлюбу. Пасля частавання ў доме маладога вясельнікі выходзілі з-за стала і ставілі пасярод хаты дзяжу.

rawpixel

- Пасад нявесты перад вянцом найбольш распаўсюджаны, чым пасад жаніха. Пасля таго, як дружкі прыбяруць нявесту, брат вёў яе на пасад. Да рукі маладой прывязвалі доўгі ручнік, адмыслова вытканы і вышыты нявестай, які па дарозе на пасад павінен замятаць сцежку, сімвалізуючы светлы шлях у жыцці маладой, яе шчаслівы лёс.

rawpixel

# Каравай

- Уласна вяселле і пачыналася з замешвання цеста на каравай і яго пячэння. Кожны момант падрыхтоўкі каравая суправаджаўся адпаведным рытуалам і песнямі.
- Мясілі каравай жанчыны “ручнікамі бяленькімі, песнямі залаценькімі, песнямі весяленькімі”.
- Каравай як вясельнае абрадавае печыва сімвалізаваў багацце, дабрабыт сям’і. У народзе лічылі, што каравай чалавек можа мець адзін раз на вяселлі, таму калі жаніўся ўдавец, выходзіла замуж удава, каравай не пяклі.
- Каравай замешвалі і пяклі каравайніцы. Найбольш характэрны, разгорнуты на поўдні, дзе кожны яго этап суправаджаўся мноствам адпаведных рытуальных дзеянняў, песень, цырымоній, заклінанняў, зваротаў да звышнатуральных істот. Пачынаўся абрад з трохразовых формул-зваротаў, у якіх прасілі дазволіць благаславіць выканаць тое ці іншае рытуальнае дзеянне, звязанае з караваем.





rawpixel

# Дакаральныя каравайныя песні

Яны стваралі гулліва-вясёлую атмасферу. Аб’ектамі насмешак у каравайных песнях – каравайніцы, дружка, свашка, гаспадары дома і каравай.

*Ой, вы сванькі, сарокі, сарокі,*
*Спяклі каравай бязбокі, бязбокі;*
*Каравайніца-нярaха,*
*Нямытая рубаха.*



rawpixel

# Каравай



- Каравайны хлеб і яго заменнікі (зерне, каша, дзяжа, салома) – абавязковыя кампаненты амаль усіх рытуалаў традыцыйнага беларускага вяселля.
- У старажытнасці каравай выконваў функцыю матэрыялізаванага Бога-продка.
- Прысутныя тройчы адказвалі: “Бог благаславіць”.
- Каравай пяклі ў хаце маладога і маладой напярэдадні вяселля ў суботу ці нядзелю, калі маладыя паехалі да шлюбу.
- Спяваць у час пячэння каравая і яго ўпрыгожвання запрашалі маладых дзяўчат; рыхтаваць дровы, печ і неабходныя прылады – жанатых мужчын; саджаць каравай у печ – нежанатага хлопца, пажадана кучаравага.
- Дровы бралі з трох двароў, ваду – з трох крыніц, масла – ад кароў першага ацёлу.



rawpixel

# Дзяльба каравая

- Гэта кульмінацыйны момант. Каравай выносілі з каморы пад музыку, сват разразаў на кавалкі.
- Падзел каравая адбываўся згодна з выпрацаваным стагоддзямі рытуалам. Старшы сват сярэдзіну аддаваў маладым, ніз (парэшву) – музыкам, астатнюю частку дзяліў па ступені сваяцтва паміж гасцямі: бацькі, хросныя і г.д.
- Ужыванне каравая звязана з павер'ем, што гэты акт садзейнічае ўрадлівасці палёў, пладавітасці скаціны, забяспечвае дастатак і шчасце ў хаце. Староннія людзі таксама імкнуліся хоць кавалак каравая ўзяць, каб пакласці ў насеннае збожжа, што будзе стымуляваць багаты ўраджай.
- Выказваліся пажаданні, якія іншы раз маглі растлумачыць многія сімвалічныя дзеянні вясельнай абраднасці.

# Дакаральныя каравайныя песні

Выкананне гэтых песень абумоўлена верай у магічную сілу смеху, наданнем здольнасці забяспечыць здароўе і шчасце маладых.

З рэшткі цеста каравайніцы выраблялі другасныя караваі, іх называлі каравайчыкі, падручнікі, шышкі, гускі, баранкі, пастушкі, пеўнікі і выкарыстоўвалі ў розныя моманты вяселля.

Ахоўную ролю выконваў падручнік, шышка, месяц, якія на працягу ўсяго вяселля маладыя трымалі ў руках, за пазухай, які падзяку духам продкаў, дамавіку і сямейным духам.

rawpixel

# Адʼезд да дому маладога

- **Адʼезд да дому маладога** – развітанне маладой з бацькоўскім домам – надзвычай эмацыянальны момант вяселля.
- Выкуп зноў-такі нявесты і жаніхом, і дружкамі. Перагароджванне дарогі – перажыткі часоў “умыкання” нявесты.
- Сустрэча маладых – часта маладыя павінны былі праехаць праз раскладзены з саломы агонь. Лічылася, што калі гэта зробяць, ніякія чары не прыстануць. Карэнне гэтага звычаю – у далёкай старажытнасці, калі агню прыпісвалі ачышчальную сілу.
- У час сустэрэчы – частаванне салодкім – пажаданне шчаслівага салодкага жыцця.

rawpixel

# Ход вяселля ў хаце ў маладога

- Адпраўлялі ў камору, кармілі, замыкалі, раніцай будзілі, адбываўся рытуал агляду пасцелі. Вяселле магло разладзіцца, калі маладая страціла цноту, або ганьбавіліся бацькоў маладой.

rawpixel




# Дзякуй за ўвагу!